**19.** У даўніну на гэта народнае свята заўсёды па вёсках і гарадах вандраваў незвычайны лялечны тэатр – батлейка. Як называлася свята?

**А)** Вялікдзень. **Б)** Зажынкі. **В)** Юр'я.
**Г)** Каляды. **Д)** Купалле.

**20.** Расстаўце ў патрэбнай паслядоўнасці словы, якіх не хапае ў народным выразе.

*По кропельцы – ..., па травінцы – ..., а па ... – ... .*

Варыянты слоў: *1) вадзіца; 2) рэчка; 3) луг; 4) копка; 5) лузе; 6) копцы; 7) краявід; 8) стог; 9) сусвет*.

**А)** 1, 2, 5, 7. **Б)** 1, 3, 5, 9. **В)** 2, 3, 6, 8.
**Г)** 2, 4, 6, 8. **Д)** 3, 4, 5, 9.

**21.** Якія з дадзеных твораў можна аднесці да фальклору?

*1) міфы; 2) казкі; 3) песні; 4) загадкі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**22.** Які ў беларускай мове ёсць адпаведнік рускаму слову *пушистый*?

**А)** пульхны. **Б)** пругкі. **В)** прыгожы. **Г)** лёгкі. **Д)** цяжкі.

**23.** Ігнат разгадваў красворд. Адно пытанне аказалася для яго цяжкім: як называецца міжнародны кінафестываль, які кожную восень праходзіць у Мінску? Дапамажыце хлопчыку выбраць правільны адказ.

**А)** "Верасень". **Б)** "Кастрычнік". **В)** "Лістапад".
**Г)** "Ералаш". **Д)** "Залатая рыбка".

**24.** На чым пісалі ў Старажытнай Русі?

**А)** на бяросце. **Б)** на папірусе. **В)** на паперы.
**Г)** на тканіне. **Д)** на палях кнігі.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 31200 экз. г. Мінск. 2018 г.

Конкурс па беларускай мове
**«БУСЛІК-2018»**

*Чацвер, 15 лютага 2018 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Падлічыце, колькі слоў у сказе.

*Успыхнуламаланкаібелымсвятломазарыланаваколле.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**2.** Якога слова не хапае ў народным выслоўі?

*Каваль без сякеры, а шавец без ... .*

**А)** грошай. **Б)** шапкі. **В)** ботаў. **Г)** стула. **Д)** яды.

**3.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў сказе?

*Мала хто з гарадскіх дзяцей бачыць такія дзівосныя цуды, як усход і захад сонца, як зорнае начное неба (В. Вітка).*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**4.** Выберыце з дадзеных толькі тыя словы, у якіх тры мяккія зычныя.

*1) возера; 2) сняжок; 3) ліпень;*
*4) лісцік; 5) чэрвень; 6) мядзведзь.*

**А)** 1, 2. **Б)** 2, 3. **В)** 3, 4. **Г)** 4, 5. **Д)** 5, 6.

**5.** На якое пытанне адказвае выдзеленае слова ў сказе?

*Усіх нас гадуюць **бабуліны** казкі.*

**А)** хто? **Б)** чые? **В)** як? **Г)** дзе? **Д)** што робяць?

**6.** Адгадайце народную загадку.

*У ваду садзіцца, а мокрым не бывае.*

**А)** вожык. **Б)** ліст. **В)** сонца. **Г)** гусь. **Д)** бабёр.

**7.** Дадзены сказ:

*Бульбу вараць, пякуць, смажаць, параць, фаршыруюць, сушаць.*

Колькі **[у]** ужыта ў дзеясловах у сказе?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**8.** Дадзены назвы беларускіх азёр:

*1) Асвейскае; 2) Дрывяты; 3) Нарач; 4) Сялява;*
*5) Мястра; 6) Чырвонае; 7) Езярышча.*

Якія назвы маюць тры склады?

**А)** 1, 3. **Б)** 2, 4. **В)** 3, 5. **Г)** 4, 6. **Д)** 5, 7.

**9.** Якога слова не хапае на месцы пропуску ў назве народнай казкі "*Каток – ... лабок*"?

**А)** сярэбраны. **Б)** залаты. **В)** бронзавы.
**Г)** жалезны. **Д)** драўляны.

**10.** Знайдзіце адгадку на літаратурную загадку В. Віткі ў пераблытаных літарах.

*Сонца пячэ,*
*Ліпа цвіце,*
*Збожжа паспявае –*
*Калі гэта бывае?*

**А)** й, я, о, н, в, с. **Б)** а, м, е, т, л. **В)** н, е, ю, н, в, с, о.
**Г)** й, і, м, з, о. **Д)** н, м, ё, д.

**11.** Ёсць імёны: *1) Саша; 2) Маша; 3) Жэня; 4) Паша; 5) Лёня*. Якія імёны выкарыстоўваюць і для хлопчыкаў, і для дзяўчынак?

**А)** усе імёны. **Б)** усе, акрамя 2. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**12.** Якія словы з дадзеных маюць склад ***ра***?

*1) аўторак; 2) рад; 3) возера; 4) раніца; 5) падворак.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 2.
**В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**13.** Назва якога музычнага інструмента ўтварылася ад слова *жаль*?

**А)** баян. **Б)** гармонік. **В)** жалейка. **Г)** кларнет. **Д)** гуслі.

**14.** У якіх словах з дадзеных літара ***ё*** абазначае два гукі?

*1) жыццё; 2) вастрыё; 3) Нёман; 4) сур'ёзны; 5) аблёт.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**15.** Выберыце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

*1) носік чайніка; 2) хвост лісіцы; 3) цвёрды намер;*
*4) здабыча золата; 5) гарачае вуголле.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**16.** Хто па прафесіі выкарыстоўвае наступныя словы: *газета, навіны, факты, сучаснасць*?

**А)** кравец. **Б)** шавец. **В)** сталяр. **Г)** артыст. **Д)** журналіст.

**17.** Дапоўніце народнае выслоўе.

*Першая ластаўка ... .*

**А)** вясны не робіць. **Б)** гнязда не робіць. **В)** у двор не залятае.
**Г)** сяброўак чакае. **Д)** мошак не ловіць.

**18.** Выберыце з дадзеных словы, якія правільна падзелены для пераносу.

*1) пад'-езд; 2) аб-'ява; 3) лёг-кае; 4) міл-ьянер; 5) са-ла-ўі.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.